### Тур IX

| | | |
|---|---|---|
| **5 балаў** | Аўтар п’ес для дзяцей “Пастушкі”, “Данілка і Аленка” | *Міхась Чарот* |
| **4 балы** | У 1921 г. стварыў адну з найбольш цікавых сваіх п’ес “На Купалле”, якая ў тым жа годзе пастаўлена Е. Міровічам у БДТ-1 | |
| **3 балы** | У 1923 г. выступіў ініцыятарам стварэння літаратурнай арганізацыі “Маладняк” | |
| **2 балы** | Паводле яго аповесці “Свінапас” створаны першы беларускі мастацкі фільм “Лясная быль” | |
| **1 бал** | Сапраўднае імя гэтага пісьменніка і драматурга – *Міхаіл Сымонавіч Кудзелька* | |

### Тур X

| | | |
|---|---|---|
| **5 балаў** | “Сцэнічны жарт у адным акце” – так аўтар ахарактарызаваў вадэвіль “Прымакі” | *Янка Купала* |
| **4 балы** | Ідэя нацыянальнай годнасці і нацыянальнага адраджэння рэалізуецца драматургам праз вобразы-антыподы Мікіты Зноска і Янкі Здольніка і праз непрымірымы канфлікт паміж імі, на якім і грунтуецца п’еса “Тутэйшыя” | |
| **3 балы** | Аўтар драматычных паэм “Адвечная песня” і “Сон на кургане” | |
| **2 балы** | Факты і падзеі з жыцця сям’і бацькоў былі пакладзены ў аснову драмы “Раскіданае гняздо” | |
| **1 бал** | Спектакль па п’есе народнага паэта “Паўлінка” – візітная картка галоўнага нацыянальнага тэатра Беларусі | |

**ІІІ. Заключная частка.**
*Падвядзенне вынікаў гульні. Узнагароджванне пераможцы.*

*У дапамогу педагогу*

Вольга ПАЛАЎКО,
выкладчык беларускай мовы і літаратуры
Пінскага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа імя А. Я. Кляшчова

# “ПТУШКА ПАЛЕСКАГА КРАЮ”

## ЛІТАРАТУРНАЯ ГАСЦЁЎНЯ

**Мэты:** спрыяць засваенню ведаў пра жыццёвы і творчы шлях Я. Янішчыц, раскрыць вобразнасць і лірызм яе вершаў; стварыць умовы для ўдасканалення навыкаў выразнага чытання паэтычных твораў і культуры вуснага маўлення; выклікаць захапленне асобай паэтэсы.

**Абсталяванне:** выстава кніг паэтэсы, артыкулы з успамінамі пра Я. Янішчыц у часопісах “Полымя”, “Маладосць”, прэзентацыя, партрэт Я. Янішчыц, аўдыязапісы песень “Старана мая азёрная”, “Маміна вішня”.

### ХОД МЕРАПРЫЕМСТВА

*Музычны фон: аўдыязапіс песні “Старана мая азёрная” (сл. Я. Янішчыц, муз. З. Яўтуховіча). Выходзяць вядучыя.*

**1-ы вядучы.**

Што ж такое
　　　　пакінуць людзям?
Што ж такое ім падарыць?
Людзям – сведкам
　　　　і людзям – суддзям,
Для якіх я радзілася жыць.
Можа,
　　　　кветак букецік весні?
Мо агеньчык у далёкай глушы?
Падару лепей
　　　　людзям песню,
Песню – голас маёй душы.

Я. Янішчыц.

**2-і вядучы.** Добры дзень, паважаныя сябры! Наша сустрэча прысвечана зямлячцы, беларускай паэтэсе Яўгеніі Янішчыц. Багатую творчую спадчыну, яркую незгасальную памяць пакінула яна ў нашых сэрцах. Дзіўнай птушкай заляцела яна ў Сад беларускай паэзіі, каб вечна жыць там.

“Смерці ў паэта няма – ёсць нараджэнне”, – так пісала Яўгенія Янішчыц пра класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча. Сказанае ў поўнае меры адносіцца і да яе. У жыццё і паэзію яна ўвайшла даверліва, са шчырым узнёслым прызнаннем у любові да ўсяго жывога.

• ***Выразнае чытанне*** *верша “Ты пакліч мяне. Пазаві…” Я. Янішчыц* ⤓.

**1-ы вядучы.** “Пачынаецца ўсё з любві, а інакш і жыць немагчыма”, – сказала Яўгенія Янішчыц, калі ёй было ўсяго 17 гадоў.

**2-і вядучы.** Нарадзілася Яўгенія Іосіфаўна Янішчыц 20 лістапада 1948 г. у в. Рудка Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям’і сялян. Маці ўспаміналa, што яшчэ ў чацвёртым класе Жэня напісала верш, прысвечаны ёй. Вершам захаплялася ўся школа. Але ён недзе згубіўся, бо не надалі яму належнага значэння. І ўсё ж яна стала паэтам. У шостым класе Жэня пачынае пісаць ужо ў Мерчыцкай школе, куды прыйшла ў 1960 г. Паэтычныя здольнасці ярка выявіліся ў першым вершы “Якубу Коласу” з нагоды 80-годдзя класіка.

• ***Выразнае чытанне*** *верша “Якубу Коласу” Я. Янішчыц* ⤓.

**2-і вядучы.** Пасля заканчэння васьмігодкі ў 1963 г. Жэня пераходзіць у Парэцкую сярэднюю школу, потым паступае на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1971-м атрымлівае дыплом настаўніцы рускай мовы і літаратуры, беларускай мовы і літаратуры. Працавала загадчыкам бібліятэкі ЦК ЛКСМБ, потым у рэдакцыях “Сельскай газеты” і часопіса “Маладосць”.

**2-і вядучы.** “Палеская ластаўка”, “Палесся мілае дзіця”, “палеская летуценніца” – так называлі ў нашай літаратуры Яўгенію Янішчыц. Сувязі з роднай вёскай, Палессем паэтэса не страціла. Здавалася ёй, што не толькі маці, але і вёска, і ўсё Палессе, усе землякі сумуюць без яе.

• ***Выразнае чытанне*** *верша “Добры вечар, землякі!” Я. Янішчыц* ⤓.

**1-ы вядучы.** Паэтэса падтрымлівала сувязі з роднымі мясцінамі, з людзьмі. Думкі пра бацькоўскі край, землякоў напоўнены пачуццём вялікай чалавечай годнасці. Яна верыла ў свой народ і яго лепшы лёс. “Тут, дзе не скончыцца песня ніколі, / І не ўпадзе на калені народ”, – так удакладняе Я. Янішчыц месца нараджэння. Месца, якому зноў і зноў прызнаецца ў любові і адданасці.

• ***Выразнае чытанне*** *верша “Не шукаю гаманлівай славы” Я. Янішчыц* ⤓.

**1-ы вядучы.** А колькі вершаў паэтка прысвяціла сваёй маці, якая не толькі падаравала жыццё, але і дала шчаслівы білет у казачную краіну Паэзію. Сваю маці Яўгенія называла “Кнігаўка маіх лірычных кніг”, а ў адным з інтэрв’ю адказала: “Самае моцнае ўражанне: жыццё маёй маці і яшчэ раз – яе жыццё!”

• ***Праслухоўванне аўдыязапісу*** *песні “Маміна вішня” (сл. У. Карызны, музыка Л. Захлеўнага).*

• ***Выразнае чытанне*** *верша “Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён” Я. Янішчыц* ⤓.

**2-і вядучы.** Яўгенія Янішчыц зведала мацярынства, яго высокі сэнс, гэта ўзбагаціла яе паэзію. Асабліва ўражвае твор “Маё адно-адзінае світанне”. Паэма напісана тады, калі любімы сын Андрэйка захварэў. Маці амаль не выходзіла з бальніцы. Гэта было “…і малітва, і заклінанне, і бязмежная любоў, і спадзяванне на лепшае”.

• ***Выразнае чытанне*** *ўрыўка з паэмы “Маё адно-адзінае світанне” Я. Янішчыц (“Любімы мой, найсонечны, найблізкі…”)* ⤓.

**1-ы вядучы.** Не магла яна не пісаць пра каханне. “Любоў мая, ты песня і маркота, і спелы бор, і вольны спеў ракі”, – так сказала паэтэса ў адным з вершаў, а ў другім дадала: “Я так цябе чакала, што ў каліне адбілася ўся мая душа”.

• ***Праслухоўванне аўдыязапісу*** *песні “Паверце, дзеванькі” (сл. У. Карызны, муз. Э. Зарыцкага).*

• ***Выразнае чытанне*** *верша “Я пачакаю” Я. Янішчыц* ⤓.

**1-ы вядучы.** Растанне з каханым успрымаецца як наканаванне лёсу, ад якога нікуды не ўцячэш (“Ні на міг ні на век – не твая. / Так і трэба, відаць, так і трэба!”), хоць было і змаганне з сабою, і смутак, і рэўнасць. Перахітрыць сябе і пераадолець каханне не ўдалося. Яно назаўсёды пасялілася ў сэрцы, напаўняючы яго болем: “Я ўжо адчайна праганяю стому, / З дажджу сляпога вобраз твой ляплю. / Табе, мой боль, табе – і больш нікому! – / Я й перад смерцю вымаўлю: люблю”.

**Сімвалам ⤓ пазначаны матэрыялы, даступныя для спампоўвання і азнаямлення, спасылкі па qr-кодзе.**

**2-і вядучы.** 25 лістапада 1988 г. жыццё Яўгеніі Янішчыц трагічна абарвалася, але яе паэзія, глыбока чалавечная, праўдзівая, светлая, заўсёды запатрабавана… Прыгадваюцца радкі развітальнага верша Генадзя Бураўкіна, якія прагучалі на яе пахаванні:

Жэня, Жэня!..
Што ж ты нарабіла?..
Як жа мы цябе не зберaглі?!.
Жорсткім ветрам паламала крылы
Ластаўцы зняверанай зямлі.
Зноў з тупым адчаем і з журбою
Мы цябе пакінулі адну.
І – не замаліць перад табою
Горкую балючую віну.
Сумная запозненая пошта
Больш не прынясе твае лісты…
Ластаўка палеская, навошта
Гэтак рана адляцела ты?..

### Спіс літаратуры


1. **Бельскі, А. І.** Паэзія Яўгеніі Янішчыц у школе (IX, XI класы) / А. І. Бельскі // Беларуская мова і літаратура. – 2004. – № 3. – С. 38–46.
2. **Казубоўская, Г.** “Ды будзе вечна звонкім рэхам звінець твой голас малады…” / Г. Казубоўская // Полесская правда. – 1998. – 18 ліст.
3. **Калядка, С.** “Любоў мая, ты песня і маркота…” : Лірыка Яўгеніі Янішчыц / С. Калядка // Роднае слова. – 1998. – № 3. – С. 21–31; № 4. – С. 36–47.
4. **Аўсяннікава, Т.** “Боль які? Якога болю эра?” : Старонкі жыцця і творчасці Яўгеніі Янішчыц / Т. Аўсяннікава // Роднае слова. – 2008. – № 11. – С. 13–14.
5. **Еўсіевіч, Т.** “Чароўная кветка беларускай паэзіі – Яўгенія Янішчыц!” : Літаратурная гасцёўня / Т. Еўсіевіч // Бібліятэка прапануе. – 2016. – № 3. – С. 4–9.
6. **Закрэўская, Н. П.** “Летуценніца на скразняках эпохі” : Літаратурна-музычная вечарына, прысвечаная Яўгеніі Янішчыц (9–11 класы) / Н. П. Закрэўская // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 3. – С. 53–58.
7. **Місюкавец, Л.** Ясяльдзянка з палескага краю : Літаратурна-краязнаўчы вечар / Л. Місюкавец // Роднае слова. – 2011. – № 1. – С. 88–92.